## VI адкрытыя міжрэгіянальныя майстар-класы
## “Вучымся ў майстроў”: падводзім вынікі

Адкрытыя міжрэгіянальныя майстар-класы педагогаў дадатковай адукацыі праводзяцца ў рамках рэспубліканскага інавацыйнага праекта “Укараненне мадэлі рэспубліканскага метадычнага кластара ў сістэму суправаджэння грамадзянска-патрыятычнага выхавання ва ўстановах дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі”, рэспубліканскага культурна-адукацыйнага праекта “Беларускае народнае мастацтва і дзеці”.

**Задачы правядзення адкрытых міжрэгіянальных майстар-класаў:**

знаёмства з эфектыўнымі і прадуктыўнымі методыкамі і тэхналогіямі трансляцыі культурных традыцый беларусаў у адукацыйнай і творчай дзейнасці аб’яднанняў па інтарэсах народнай дэкаратыўна-прыкладной і фальклорнай (музычнай, тэатральнай, харэаграфічнай) творчасці;

падтрымка і развіццё творчай ініцыятывы, актыўнасці педагагічных работнікаў і іх прафесійнага майстэрства;

удасканаленне этнакультурных кампетэнцый удзельнікаў адкрытых міжрэгіянальных майстар-класаў;

выяўленне і абагульненне рэгіянальнага інавацыйнага педагагічнага вопыту па этнакультурным выхаванні навучэнцаў.

Адкрытыя міжрэгіянальныя майстар-класы праводзяцца з 2016 года з перыядычнасцю раз у 2 гады. За гэты перыяд адбылося 320 майстар-класаў на базе 204 устаноў адукацыі. Свой вопыт і майстэрства прадставілі больш за 350 педагогаў і аўтарскіх калектываў:

•***I адкрытыя міжрэгіянальныя майстар-класы*** “Вучымся ў майстроў” (2016 г.) накіраваны на выкарыстанне традыцыйных тэхналогій мастацкага тэкстылю (ткацтва, вышыўка, габелен, валянне з воўны і інш.) у адукацыйным працэсе аб’яднанняў па інтарэсах дэкаратыўна-прыкладной творчасці;

•***II адкрытыя міжрэгіянальныя майстар-класы “Творчасць і майстэрства – шлях да дасканаласці”*** (2016 г.). Удзельнікі – пераможцы, лаўрэаты і дыпламанты Рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства педагагічных работнікаў “Педагог года ўстановы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі”;

•***III адкрытыя міжрэгіянальныя майстар-класы “Абрадавая атрыбутыка і народная лялька ў святочнай культуры беларусаў”*** (2018 г. – Год малой радзімы) – адраджэнне веснавых каляндарна-абрадавых і мастацкіх традыцый рэгіёнаў, актуалізацыя педагагічных практык этнакультурнага выхавання і творчага развіцця дзяцей і моладзі сродкамі беларускага традыцыйнага мастацтва;

•***IV адкрытыя міжрэгіянальныя майстар-класы “Святочна-абрадавая культура беларусаў: традыцыі і сучаснасць”*** (2021 г.) праходзілі ў анлайн-фармаце з выкарыстаннем сучасных сродкаў анлайн-камунікацыі. Накіраваны на вывучэнне і папулярызацыю мастацкай спадчыны рэгіёнаў, адраджэнне беларускіх святочна-абрадавых традыцый зімовага цыкла,

развіццё медыякультуры як кампанента сучаснай адукацыйнай прасторы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

• ***V адкрытыя міжрэгіянальныя майстар-класы "Мастацкая рэканструкцыя і аднаўленне элементаў этнакультуры ў дзейнасці аб'яднанняў па інтарэсах фальклорнага і дэкаратыўна-прыкладнога кірункаў: вопыт і вынікі"*** (2023 г.) накіраваны на вывучэнне і рэканструкцыю беларускіх народных мастацкіх традыцый – абрадаў, музычнай і харэаграфічнай спадчыны, твораў народнага мастацтва, дэкаратыўна-прыкладной творчасці – праз дзейнасць аб'яднанняў па інтарэсах.

Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі працягвае традыцыю правядзення адкрытых міжрэгіянальных майстар-класаў.

***З 12 па 30 мая 2025 года*** прайшлі VI адкрытыя міжрэгіянальныя майстар-класы педагогаў дадатковай адукацыі "Вучымся ў майстроў" (далей – міжрэгіянальныя майстар-класы).

Аўтарскі педагагічны вопыт прадставілі **62 педагагічных работніка** (педагогі дадатковай адукацыі, настаўнікі, метадысты і інш.) з **42 устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі і агульнай сярэдняй адукацыі** ( з іх 33 УДАДіМ)

Адбылося **55 майстар-класаў** ва ўсіх рэгіёнах і г. Мінску:

*Брэсцкая вобласць – 12 майстар-класаў (далей – МК) / 10 устаноў адукацыі (далей – УА);*

*Віцебская вобласць – 6 МК / 4 УА;*

*Гомельская вобласць – 6 МК/ 6 УА;*

*Гродзенская вобласць – 8 МК / 6 УА;*

*Мінская вобласць – 9 МК / 8 УА;*

*Магілёўская вобласць – 6 МК / 4 УА;*

*Мінск – 4 МК / 3 УА;*

*НЦМТДМ – 4 МК.*

Майстар-класы прайшлі на базе васьмі ўстаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі:

*Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі;*

*Брэсцкі дзяржаўны абласны цэнтр маладзёжнай творчасці;*

*Віцебскі гарадскі цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі;*

*Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі г. Калінкавічы;*

*Гродзенскі дзяржаўны абласны Палац творчасці дзяцей і моладзі;*

*Магілёўскі абласны цэнтр творчасці;*

*Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі імя Хаіма Суціна г.п. Смілавічы Чэрвеньскага раёна;*

*Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі "Ветразь" г. Мінска.*

У майстар-класах прынялі ўдзел ***больш за 380 педагагічных работнікаў*** з розных рэгіёнаў Беларусі. Адкрытыя міжрэгіянальныя майстар-класы праходзілі па розных накірунках беларускай народнай творчасці: беларуская ***народная дэкаратыўна-прыкладная творчасць (39 майстар-класаў); фальклорная творчасць (16 майстар-класаў)***, а таксама асобныя майстар-

класы мелі інтэграваны характар, аб'ядноўваючы вышэйпералічаныя напрамкі, і праводзіліся калектывам аўтараў шляхам рэалізацыі сумеснага творчага праекта.

Змест майстар-класаў па накірунку *народная дэкаратыўна-прыкладная творчасць* уключаў дэманстрацыю тэхналогій розных відаў народнай дэкаратыўна-прыкладной творчасці, дзейнасць па вырабе дэкаратыўна-прыкладной атрыбутыкі і мастацкіх рэчаў, непасрэдны і каменціраваны паказ прыёмаў работы, рашэнне практычных задач. Аўтары прадэманстравалі шырокую панараму творчых пошукаў у вырабе мастацкіх твораў народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, акцэнтавалі ўвагу на традыцыйных прыёмах і тэхніках розных рэгіёнаў Беларусі.

Мастацкія творы былі зроблены з выкарыстаннем розных прыродных матэрыялаў у розных відах і тэхніках народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: кераміка (стварэнне керамічнага посуду, дзіцячых цацак-свістулек, і інш.), мастацкі роспіс (па шкле, па тканіне, пісанка), мастацкі тэкстыль (вышыўка, габелен, макрамэ), валянне з воўны, ткацтва (на ніту, на дошчачках і інш.), выцінанка, набойка, народная лялька ў розных матэрыялах (абрадавая, сувенірная, гульнёвая), мастацкая апрацоўка саломкі, лозапляценне, кождызайн і інш.

Змест майстар-класаў па накірунку *фальклорная творчасць* уключаў дэманстрацыю дзейнасці і методыкі па засваенні песенных, харэаграфічных, музычных рэгіянальных традыцый, прэзентацыю мастацкай рэканструкцыі святочна-абрадавых комлексаў з выкарыстаннем абрадавай атрыбутыкі і музычнай дзеі, прэзентацыю і мастацкую рэканструкцыю тэатра батлейка, батлеечнага прадстаўлення з выкарыстаннем адпаведных элементаў, непасрэдны і каменціраваны паказ прыёмаў работы, рашэння практычных задач.

Падчас майстар-класаў былі прадстаўлены каляндарна-абрадавыя, сямейна-абрадавыя, пазаабрадавыя традыцыі розных рэгіёнаў Беларусі. Педагогі-майстры акцэнтавалі ўвагу на методыцы пераймання і выкарыстання фальклорных традыцый беларусаў у адукацыйнай дзейнасці: на асаблівасцях вывучэння песенных традыцый Падняпроў'я (Мсціслаўскі рэгіён), Паазер'я, Панямоння, Цэнтральнай Беларусі; на адметнасцях і стылістыцы выканання побытавых танцаў, народнай інструментальнай музыкі (Гомельшчына), на зберажэнні мясцовых традыцый праз сумесную дзейнасць педагогаў, дзяцей і бацькоў, вопыце мастацкай рэканструкцыі народнага касцюма свайго рэгіёна і мясцовых абрадаў (Брэстчына), народнага тэатра "Батлейка" і інш.

Педагогі-майстры прадэманстравалі высокі ўзровень прафесійнага майстэрства, прадставілі на аснове асэнсавання свайго вопыту традыцыйныя і сучасныя інавацыйныя педагагічныя практыкі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і фальклорнай творчасці, якія могуць быць выкарыстаны ў адукацыйным працэсе і будуць садзейнічаць яго эфектыўнасці.

Працягам увасаблення ідэі аб захаванні, вывучэнні і распаўсюджванні педагагічнага вопыту, цікавых практык у галіне этнакультурнага выхавання

з’яўляецца стварэнне фонду інфармацыйна-аналітычных і метадычных матэрыялаў аўтараў перадавога педагагічнага вопыту. Гэта і

электронная бібліятэка Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі;

прэзентацыя матэрыялаў у рамках рэспубліканскай выстаўкі навукова-метадычнай літаратуры, педагагічнага вопыту і творчасці навучэнскай моладзі;

публікацыі ў рэспубліканскіх перыядычных педагагічных выданнях і зборніках;

банк відэаматэрыялаў.

Пры падвядзенні вынікаў педагогі высока ацанілі эфектыўнасць адкрытых міжрэгіянальных майстар-класаў “Вучымся ў майстроў”, у тым ліку іх змястоўны і арганізацыйны кампанеты, каштоўнасць стварэння прафесійнай супольнасці педагагічных работнікаў для вырашэння задач па пераймання і захаванні народных мастацкіх традыцый, магчымасць распаўсюджвання вопыту творчага развіцця дзяцей і падлеткаў сродкамі беларускага традыцыйнага мастацтва.

Арганізацыя адкрытых міжрэгіянальных майстар-класаў застаецца і сёння пасляховай практыкай, якая спрыяе актывізацыі педагагічнага руху ў сферы этнакультурнага выхавання дзяцей і моладзі, развіццю этнакультурных кампетэнцый педагогаў і навучэнцаў, інтэграцыі ўсіх рэсурсаў і аб'яднанне актуальных напрамкаў народнай творчасці ў адукацыйнай дзейнасці дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.